**КВАЛІТАТЫЎНАЕ ВЕРШАСКЛАДА́ННЕ**, тып вершаскладання (сілабічны, сілаба-танічны і танічны), у якім адрозніваюць склады пэўнай сілы вымаўлення (якасці) — націскныя ад ненаціскных. Працягласць складоў не мае значэння. Лічыцца, што пераход ад *квантытатыўнага*, характэрнага для паэзіі антычнасці, да К.в. пачаўся ў Сярэдневякоўі, калі вусная паэзія паступова рабілася пісьмовай, дзякуючы чаму адбывалася аддзяленне верша ад музыкі,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

г.зн. вырашальнае значэнне пачыналі мецць моўныя адзінкі (склад, аб'ядананыя націскам групы складоў), а не працягласць гучання. Дамінаваць К.в. пачало з развіццём новых еўрап. моў, у якіх працягласць вымаўлення галосных гукаў не выконвала сэнсаадрознівальнай ролі (як, напр., у стараж.-грэч., лац., арабскай і інш. мовах). Пануючы тып вершаскладання ў сучаснай бел. і еўрап. паэзіі.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова